ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! 17 лістапада 1931 г. № 263 (1534)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Вялікая справа бальшавіцкіх будняў

...бы дасягнулі значных вынікаў у ...касным павялічэньні сьвінога...ту ў соцыялістычным сэктары. ...галоўе сьвіней даведзена да 608 ...яч штук, з іх—181500 сьвінама... Праведзена вялікая работа ...па будаўніцтву і падвядзеньню ...мовае базы пад соцжывёлагадоў... Але гэтага мала. У нас усё ...э візкая таварнасьць, вялікі ...ход маладняка (20-30 проц.) ...інаматкі на (40-50 проц.) халас... (саўгас „Будзёнавец“, „Вішнёў...“, „Вяленьсінча“ і г. д.). Мы ...э не аўладалі тэхнікай сьвінагадоўлі.

Перадавыя комсамольскія ячэйкі ...сьвінагадоўчых гаспадарак (ячэйка саўгасу „КП“) выступілі ў бой за высокую таварнасьць, за „тону апарос“ у 6 месячным узросьце, за аўладаньне тэхнікай сьвінагадоўлі. ...а вялізарнейшай гаспадарчай ...насьці мерапрыемства перадаві... падтрымана гаспадарчымі організацыямі і радам комсамольскіх ячэек. Комсамольская ячэйка саўгаса „Іваць“ дасягнула вялікіх посьпехаў: значна ўзьнята таварнасьць, ...ход маладняка зьведзен да 8 проц. ...вёла поўнасьцю падрыхтавана к ...е, організован комсамольскі сьві... ...ік, на якім створана цэхавая ...самольская ячэйка, рэгулярна ...цуюць 2 гурткі па аўладаньню ...нікай, соцспаборніцтвам і ўдар...твам ахоплены ўсе рабочыя, ўся ...ота пераведзена на зьдзельна-...эміяльную аплату, ліквідавана ...безьлічка. Саўгас дабіўся таго, ...то аднятае ад маткі ў 2-х месяч... узросьце парасё важыць 14-... кгр.

На жаль гэтае важнейшае мерапрыемства большасьцю комсамольскіх ячэек Беларусі, асабліва ячэйкамі колгасных ферм, не падхоплена. Раённыя камітэты сьвінагадоўчых раёнаў і ячэйкамі сьвінагадоўчых саўгасаў і колгасных тавар ных ферм. Ня выканана пастанова Сакратарыяту ЦК ЛКСМБ аб уключэньні ў соцыялістычнае спаборніцтва за „тону апарос“.

Большасьць раённых комсамольскіх камітэтаў сьвінагадоўчых раёнаў не паклапаціліся аб тым, каб вопыт перадавікоў у барацьбе за „тону апарос“, за аўладаньне тэхнікай зрабіць набыткам ...іх ячэек свайго раёну, не ўзьнялі ініцыятывы шырокіх мас комсамольцаў і колгаснай моладзі вакол гэтага конкрэтнага гаспадарчага лёзунгу.

Так далей быць ня можа. Трэба рашуча пакончыць з недаацэнкаю ўздыму таварнасьці соцыялістычнага сэктару і яго гаспадарчага ўмацаваньня.

З мэтай перадачы вопыту барацьбы за „тону апарос“ перадавымі саўгасамі і комсамольскімі ячэйкамі, усебеларускі штаб кіраўніцтва, які створаны пры беладдзяленьні „Комсамольскай праўды“ і газэце „Чырвоная зьмена“, 19 л стапада праводзіць радыё-пераклічку. Раённыя камітэты комсамолу, ячэйкі якіх будуць удзельнічаць у пераклічцы, абавязаны забясьпечыць падрыхтоўку ячэек, дапамагчы ім абагуліць і перадаць свой лепшы вопыт барацьбы за „тону апарос“. Рэшта комсамольскіх камітэтаў сьвінагадоўчых раёнаў павінна выкарыстаць усебеларускую радыё-пераклічку для таго, каб уключыць усе ячэйкі саўгасаў і колгасных таварных фэрм у барацьбу за „тону апарос“, за аўладаньне тэхнікай сьвінагадоўлі, за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, за павышэньне прадукцыйнасьці і таварнасьці сьвінагадоўчых і жывёлагадоўчых саўгасаў і колгасных таварных фэрм. Рашуча перабудаваць работу саўгасаў і колгасных таварных фэрм паводле 6 умоў т. Сталіна, поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку, укараніць гаспадарчы разрахунак, зьдзельшчыну і зьдзельна-прэміяльную сыстэму аплаты, соцспаборніцтва і ўдарніцтва зрабіць асноўным мэтодам работы.—Вось баявыя задачы дня.

Усе раённыя камітэты павінны зараз-жа ўключыцца ва ўсесаюзнае спаборніцтва за „тону-апарос“, за аўладаньне тэхнікай сьвінагадоўлі, за організаваную сустрэчу зімы, за падвядзеньне магутнай кармовай базы пад сьвінапагалоўе.

Барацьба за „тону апарос“—зьвяно з агульнага ланцуга мерапрыемстваў па організацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў, у бязьлітаснай барацьбе з правай і „левай“ практыкай, з опортуністымі, якія не жадаюць змагацца за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў,—за „тону-апарос“, за ажыцьцяўленьне 6 умоў т. Сталіна, за аўладаньне тэхнікай сьвінагадоўлі.

Лясная прамысловасьць БССР выканала пяцігодку ў 3 гады

Перамога заклікае змагацца за выкананьне плянаў лесанарыхтовак

Пастанова ЦК ЛКСМБ—конкрэтны плян дзеяньня комсамолу ў барацьбе за лес—павінна быць выканана

Лясная пяцігодка выканана ў 3 гады

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі пяцігодка лясной прамысловасьці выканана ў 3 гады.

Агульны пяцігадовы плян лесанарыхтовак па Лесбеду ў 13309000 км драўніны выканан за 3 гады ў разьмеры 14936500 км г. значыць, што пяцігадовы плян лясной прамысловасьці выканан на 112,2 пр.

Уведзены ў строй такія гіганты, як Бабруйскі і Барысаўскі комбінаты, заканчваецца будаўніцтва Гомельскага комбінату. Для задавальненьня ўзросшых запатрабаваньняў будаўніцтва савецкай краіны ўведзены ў эксплёатацыю новыя віды вытворчасьці: стандартныя дамы, сілосныя вежы, будаўнічыя дэталі і г. д.

За кошт рацыянальнага скарыстаньня драўніны і правільнай яе распрацоўкі ўдалося перавесьці значны процант драўлянай масы ў будаўнічы матар'ял. Лясная прамысловасьць БССР наладзіла выраб раду новых відаў продукцыі (гнутыя мэблі, гонты, сьпіцы, бачкаркі стружная тара і г. д.) з драўніны, якая раней ішла выключна на апал.

Значна палепшылася матар'яльнае становішча лясных рабочых.

У гэтым годзе сярэдняя месячная зарплата на аднаго рабочага перавысіла на 12,5 проц. тыя разьмеры зарплаты, якія вызначаны на апошні год пяцігодкі.

Усе гэтыя поспехі дасягнуты лясной прамысловасьцю БССР, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву УсеКП(б) і разгортваньню соцспаборніцтва. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам УсеКП(б) і КП(б)Б яшчэ з большым энтузіязмам возьмецца за выкананьне другой пяцігодкі.

Віцебская комсамолія—у баку ад лесанарыхтовак

Віцеск. Газэта „Віцебскі пралетары“ на сваіх старонках ня раз адзначала чарапашыя тэмпы транспорту дроў працоўным гораду і ўстановам.

Грамадзкія і КСМ організацыі не дапамагаюць чыгунцы ў згрузцы дроў рабочым цэнтрам. Комсамольскія організацыі Віцебску не практыкуюць суботнікаў на чыгунцы для разгрузкі і адпраўкі дроў па прадпрыемствам (комсамольскі колектыў ф-кі „Комінтэрн“).

Бязьдзейнічаюць і віцебскія навучальныя ўстановы.

Комсамольская організацыя Віцебску павінна прыняць актыўны ўдзел у выкананьні і перавыкананьні плянаў нарыхтовак, шырока ўжываючы мерапрыемствы, якія вызначаныя пастановай ЦК.

Юнкор „Ч.З.“ Я. Узьбярэжны

Палепшыць удзел КСМ організацыі ў лесанарыхтоўках

(З пастановы бюро ЦК ЛКСМБ ад 25-Х-1931 г. аб удзеле ЛКСМБ у лесанарыхтоўка)

За пэрыод з першага студзеня па 11 кастрычніка гадовы плян выканан па буддраўніне на 80,3 проц.,—вывезена 59,3 проц., па апалу на 37,3 проц.—вывезена 44,9 проц. Такое становішча з выкананьнем пляну высечкі і вывазкі дроў і лесаматар'ялаў пагражае парушыць плянавае забясьпячэньне апалам прамысловасьці цэнтраў БССР.

КСМ організацыі яшчэ не пераключыліся па-баявому на аказаньне практычнай дапамогі ў выкананьні пляну лесанарыхтовак.

Бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Абавязаць ГК і РК КСМ зараз-жа прыступіць да шырокай масавай мобілізацыі ўсёй грамадзкасьці гораду і вёскі на сапраўднае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб поўным і своечасовым выкананьні пляну высечкі і вывазкі лесу.

ЦК указвае КСМ орг-цыям, што барацьба за выкананьне пляну лесанарыхтовак ёсьць барацьба за стварэньне паліўнай базы для пролетарскіх цэнтраў БССР, за забясьпечаньне будматар'яламі новабудоў. На зімовы час гэта праца павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсёй КСМ орг-цыі, асабліва вясковай яе часткі, дзеля чаго неабходна:

а) РК і ячэйкам зараз-жа забясьпечыць актыўны ўдзел у організацыі набору рабочай сілы, садзейнічаць заключэньню дагавораў з колгасамі, і вярбоўцы аднаасобнікаў беднякоў і серадняков, ствараючы спэцыяльныя КСМ брыгады рабочай і гужавой сілы, праводзячы растлумачэньне ільгот для лесарубаў і возчыкаў.

б) РК і КСМ ячэйкі абавязаны на аснове разгортваньня і перабудовы масавай работы, перанёсшы яе ў брыгаду, групу, на справе дабіцца ахопу ўсіх комсамольцаў рабочых і моладзі ўдарнымі групамі і брыгадамі, разгортваючы соцспаборніцтва, пераводзячы на гаспадарчы разрахунак ўдарныя брыгады і ў першую чаргу маладзёжныя.

2. РК ЛКСМБ ячэйкам выдзеліць спэцыяльных комсамольцаў для масавай работы ў бліжэйшых лесасеках, чытка газэт, даводзеньне пляну высечкі і вывазкі лесу і норм дзеннай выпрацоўкі да кожнага рабочага, возчыка, зьнішчэньне неахопаў, якія перашкаджаюць выкананьню пляну лесанарыхтовак.

3. Прапанаваць ГК і РК організаваць комсамольскія ячэйкі ў брыгадах лесарубаў, ўсямерна дапамагаючы ім і кіруючы іх працай. Орг-аддзелу ЦК у дэкадны тэрмін распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы аб рабоце КСМ ячэек на лесанарыхтоўках.

4. ЦК зьвяртае асаблівую ўвагу Барысаўскага, Рэчыцкага, Асіпавіцкага, Быхаўскага і Мазырскага РК КСМ, як ор-цый буйнейшых леспрамгасаў, на тое, каб яны дабіліся такога ўдзелу організацыі ў лесанарыхтоўках, які-б забясьпечыў стопроцантнае выкананьне пляну.

5. Рагачэўскаму РК ЛКСМ зараз-жа прыступіць да поўнага ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК ЛКСМБ аб перэтварэньні Рагачэўскага леспрамгасу ў комсамольскі, аказваць яму практычную дапамогу ў забясьпечаньні рабочай сілай, у організацыі працы на лесанарыхтоўках, і ў наладжваньні культурнай работы з тым, каб гэты леспромгас па ўсіх паказчыках зьявіўся ўзорным для ўсіх леспрамгасаў БССР. Жлобінскаму і Рагачаўскаму РК выканаць разьвёрстку па мобілізацыі комсамольцаў для леспрамгасаў.

6. На вопыце КСМ організацый, абавязаць Сьмілавіцкі, Глускі, Чэрвеньскі, Заслаўскі, Койданаўскі, Бабруйскі і Клічаўскі РК ЛКСМБ прыступіць да організацыі комсамольскіх эшалёнаў па адпраўцы і забясьпечаньню Менску дрывамі. Лёзьненскаму, Сіроцінскаму, Гарадоцкаму РК ЛКСМБ забясьпечыць організацыю комсамольскіх эшалёнаў дроў для Віцебску. Веткаўскаму, Уваравіцкаму, Буда-Кашалёўскаму РК КСМ прыступіць да організацыі і адпраўкі комсамольскіх эшалёнаў дроў Гомелю

Абавязаць РК і ГК КСМ заразжа мобілізаваць усю КСМ організацыю на вывазку дроў пролетарскім цэнтрам БССР, разгарнуўшы шырокую кампанію па організацыі самазагатовак дроў, уцягнуўшы ў гэту кампанію прадпрыемствы і ЖАКТы.

Менскаму, Віцебскаму і Гомельскаму РК забясьпечыць своечасовую разгрузку прыбываючых эшалёнаў і аказаць належную дапамогу вясковым організацыям.

7. Прапанаваць Менскаму ГК, Бярэзінскаму, Асіпавіцкаму, Клімавіцкаму, Крупскаму, Вушацкаму, Бешанковіцкаму, Узьдзенскаму, Барковіцкаму і Койданаўскаму РК вылзеліць па аднаму комсамольцу на кіруючую работу ў Лесрабкоопе.

ЦК зьвяртае асаблівую ўвагу КСМ організацыі на неабходнасьць баявога ўключэньня і мобілізацыі ўсіх зьвеньняў організацыі і грамадзкасьці на лесанарыхтоўкі, даючы рашучы адпор клясаваму ворагу.

9. Паставіць перад трэстам Лесбуду пытаньне аб адпаведнай падрыхтоўцы да стварэньня належных умоў працы і быту мобілізаваных комсамольцаў.

Барысаў адстае ў нарыхтоўцы дроў

Лесанарыхтоўкі ў Барысаўскім раёне праводзяцца надзвычай марудньмі тэмпамі. Рад організацый недаацэньвае галоўную задачу лесанарыхтовак—забясьпечаньне прамысловых цэнтраў. Леспрамгас не мобілізаваў работнікаў апарату для практычнай дапамогі сельсаветам і колгасам у нарыхтоўках.

Умовы з колгасамі на нарыхтоўку і вывазку дроў заключаны, але колгасы ня выконваюць узятых на сябе абавязацельстваў. Прыкладна, колгас „Сталіна“ заключыў умову на нарыхтоўку 1050 куб м. і вывазку 1200 куб м. старшыня колгасу зараз гаворыць: „Нам няма часу няма людзей“. Колгас „Праўда“ і іншыя ігноруюць пастанову партыі і ўраду аб лесанарыхтоўках.

Райколгассаюз ня прымае рашучых мер да колгасаў, якія ганебна плятуцца ў хвасьце дрованарыхтовак, сваёй опортуністычнай бязьдзейнасьцю зрываюць работу, і ня даў рашучага адпору настроям аб немагчымасьці ўдзелу колгасаў у дрованарыхтоўках.

У выніку такой працы кіруючых органаў Нэмалінкі вучлесгас плян вывазкі выканаў на 5 проц. Кулацка-заможныя гаспадаркі выканалі на 5 проц. давезеныя да іх пляны нарыхтовак

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ

Кожны дзень пашыраць перамогі!

У найкарацейшы тэрмін рэалізуем дырэктывы партыі аб першапачатковай апрацоўцы і здачы лёну дзяржаве

З-за паліва зрываць апрацоўку—злачынства

Полаччына. У Гомельскім сельсавеце надзвычайна слаба праводзіцца першапачатковая апрацоўка і здача ільнавалакна дзяржаве. Колгасы „Кастрычнік“, „Іскра“ і „Перамога“ не апрацавалі ніводнага паліва лёну з-за таго, што апалу няма.

Райколгассаюз і сельсаветы не клапоцяцца аб тым, каб праз мобілізацыю ўнутраных апалавых рэсурсаў забясьпечыць сушылкі дрывамі.

Партыйная і комсамольская організацыя Полачыны абавязана мобілізаваць ініцыятыву мас колгасьнікаў на выкарыстаньне ўсіх унутраных рэсурсаў, каб у найкарацейшы тэрмін скончыць першапачатковую апрацоўку і здаць дзяржаве ільнавалакна.

Затрымаць апрацоўку з-за апалу —гэта злачынства.

Б.

Біцца за колькасьць і якасьць

Бабруйск. 14-ХІ (БЕЛТА). Ільнавалакно вельмі слаба паступае на Бабруйскую ільнабазу Белтэкстыльаб'яднаньня. На 10 лістапада Глускі, Парыцкі, Клічаўскі, Стара-Дарожскі, Асіпавіцкі, Рагачэўскі і Жлобінскі раёны не здалі ніводнага кілё ільнавалакна і пянькі. Паводле вестак, на раённых складах падоўгу затрымліваецца загатоўленае ільнавалакно.

Загатоўчыя організацыі ў пагоні за колькасьцю не зьвяртаюць увагі на якасьць прымаюць ад здатчыкаў ільнавалакно не апрацаванае: не трапанае і з кастрыцаю. Паступіўшыя партыі ільнавалакна на 90 проц. сырэц. 25-30 проц. загатоўленай масы зусім няпрыгодна для апрацоўкі на тэкстыльных фабрыках. Пянька паступае выключна сырою і не падвязанаю.

Тэрмінова ўключыцца ў месячнік

СЛУЦАК. Раён ня ўключыўся ў месячнік першапачатковай апрацоўкі і здачы дзяржаве ільнавалакна. У колгасе „Чырвоны маяк“ і іншых машын для апрацоўкі ільна валакна неадрамантаваныя. Праўленьне колгасу, сельсавет, партыйныя і комсамольскія ячэйкі ня ўжылі ніякіх захадаў, каб ліквідаваць прарыў.

У колгасе „Чырвоны маяк 1“ зараз распачалася пераапрацоўка рёну, але праца праходзіць марудна зьдзельшчына не ўкаранена, адсутнічае соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Райком комсамолу павінен тэрмінова ўключыцца ў месячнік першапачатковай апрацоўкі лёну. Мобілізаваць усю комсамольскую організацыю на ўдарнае правядзеньне гэтай работы.

Бранавец.

Толькі 50 трактароў на зябліва

Дырэктывы партыі і ўраду ня выкананы. Комсамол ня ўключыўся ў барацьбу за зяблівае ворыва

Вушачы. (ад нашага спэцкора). Зяблівае ворыва ў раёне як колгасным, так і аднаасобным сэктарамі праводзіцца нездавальняюча. Плян выканан усяго на 35 проц.

Асноўныя прычыны—ў тым, што дырэктыву партыі і ўраду перакінуць на ворыва ня менш 50 проц. конскай цягавай сілы і 90 проц. трактароў ня выканалі МТС і колгасы. З 32 трактароў толькі 18 працуюць на зяблівым ворыве. У выніку, колгасы, якія абслугоўваюцца МТС, засталіся ў глыбокім тыле ворыва.

Аднаасобны сэктар плян зяблівага ворыва выканаў толькі на 13 проц. Сельсаветы, партыйныя і комсамольскія ячэйкі недаацэньваюць значэньня аднаасобнага сэктару.

Весьніцкі с-савет плян зябліва выканаў толькі на 8 проц. Маладавецкі на 30, Вяліка-Далецкі на 28, Вацлабоўскі на 26, Жарскі на 30, Кубліцкі местачковы савет на 30, Зарачанскі на 25, Ісайскі на 24 Глыбачанскі на 27, Сарочынскі на 28.

Раённая газэта „Прымежны колгасьнік" занесла гэтыя с-сельсаветы на чорную дошку С-савет, партыйная і комсамольскія ячэйкі энэргічных мер ня ўжылі, каб зьняцца з чорнай дошкі і па-ўдарнаму выканаць дырэктывы партыі аб 100 проц. выкананьні пляну зябліва.

Большасьць комсамольскіх ячэек раёну ня прымаюць удзелу ў барацьбе за зябліва. Ячэйка Весьніцкага с-савету не абгаварыла на сходзе пляну ворыва і конкрэтных мерапрыемстваў. Паасобныя комсамольцы з ячэйкі колгасу „Чырвоны комбайн" патураюць кулаку ў яго агітацыі аб тым, што зяблівае ворыва ня ўвойдзе ў прыбытак г. г., а таму і ня трэба біцца за плян.

Па с-саветах, дзе партыйныя і комсамольскія ячэйкі па-бальшавіцку ўключыліся ў барацьбу за зябліва, ёсьць вялікія дасягненьні. Так Вушацкі местачковы савет выканаў плян на 85 проц. Гарбаціцкі—на 72 і Кубліцкі на 64.

Для зябліва засталіся лічаныя дні. Комсамолія Вушачаў абавязана па-баявому выступіць у бой з прарывамі, даць рашучы адпор усялякім опортуністычным самацёчным настроям, організаваць у колгасах ударныя комсамольскія і маладзёжныя брыгады, шырока разгарнуць палітычна-масавую работу, каб у бліжэйшыя дні выканаць плян зябліва.

Пусёўка наркомзема тав. Якаўлева, аб 100 проц. узьняцьці яравога кліну 1932 г. пад зябліва павінна быць выканана. **Кароль**

Выканаць дырэктывы партыі

На 30-е кастрычніка Слуцкі раён правёў зяблівае ворыва на 40,9 проц. пляну. Кіраўнікі раённых устаноў недаацэньваюць зябліва—гэтай баявой задачы дня.

Комсамол Случчыны ня б'ецца па ўдарнаму за поўнае выкананьне і перавыкананьне пляну зяблівага ворыва.

Алесь Шпакоўскі.

Усебеларуская конфэрэнцыя гаспразрахунковых брыгад

Для большага выяўленьня вопыту работы гаспадарча-разрахунковых брыгад, ЦСПСБ і ВСНГ на 26-га лістапада

СКЛІКАЮЦЬ УСЕБЕЛАРУСКУЮ КОНФЭРЭНЦЫЮ гаспадарча-разрахунковых брыгад

У конфэрэнцыі прымуць удзел усе прадпрыемствы БССР. Дэлегаты на конфэрэнцыю павінны абірацца сходамі брыгад. Кожны дэлегат павінен прывесьці матар'ялы якія-б характарызавалі ўкараненьне гаспадарчага разрахунку на прадпрыемствах.

Вывучым сыравінную базу консэрвнай прамысловасьці БССР

На тэрыторыі БССР налічваецца каля 30000 га садоў, ураджай з якіх складае прыблізна да 200 тысяч тон, пад ягаднікамі—каля 500 га, ураджай з якіх складае каля 3 тысяч тон і 70 тыс. га пад гародамі, ураджай з якіх складае да 650 тысяч тон.

Плянам НКЗ Беларусі вызначана пашырэньне плошчы за бліжэйшыя 5 год пад садамі да 100 тысяч га, пад ягаднікамі да 30 тыс. га.

З часам пойдуць пладаносіць сады дадуць каля 1,5—2 млн. тон яблык.

Ягаднікі пры адносна прастой іх культуры вельмі хутка (пладаносяць на другі год) пачынаюць даваць ураджай, які забясьпечвае збор каля 150 тысяч тон добрай сыравіны для тэхнічнай перапрацоўкі.

Апрача культурнай сыравіны мы маем вялікае багацьце грыбоў, лясных ягад, як: чарніц, суніц, маліна, журавіна, брусьніца, рабіна, каліна і інш.

Зараз дасканалага ўліку колькасьці гэтай сыравіны і грыбоў, дзе яна канцэнтруецца мы ня маем, але для будучага будаўніцтва консэрвавай прамысловасьці трэба ўлічваць [illegible].

Улік гэтай сыравіны для мэт тэхнічнай перапрацоўкі неабходны. Таму у бліжэйшы час трэба скласьці сістэматычную карту з належным апісаньнем параённа культурных відаў сыравіны яблык, груш, вішань; сьлў, ягаднікаў і гароднін, таксама дзікіх ягад і грыбоў.

Разам з дасканалым улікам наяўнай сыравіны неабходна заняцца вывучэньнем магчымасьці разьвядзеньня ў тым ці іншым раёне новых відаў расьлін для консэрвавай прамысловасьці: спаржу, кабачкі, баклажаны, салодкі перац, цьвятную капусту, шпінат, консэрвны гарошак, фасолі, бабы, равеню і інш. Трэба безадкладна заняцца вывучэньнем і палепшаньнем культуры дзікіх ягад: чарніц, брусьніц, журавін, рабіны, а таксама грыбоў. На выкананьне гэтых задач неабходна зараз-жа зьвярнуць ўвагу. **Г.**

КОМСАМОЛ БАБРУЙСКУ ШТУРМАВАЎ ДРЭННА

ЎЗЬНЯЦЬ ЭНТУЗІЯЗМ КОМСАМОЛЬЦАЎ І КОЛГАСНАЕ МОЛАДЗІ НА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

Энэргічна біцца за збожжа

Абвешчаны комсамолам дэкаднік штурму ня даў яшчэ патрэбнага зруху ў Бабруйскім раёне. На 1-е лістапада плян выканан усяго на 56,8 проц. Комсамольскія ячэйкі „Нэйлебен", Данчаўская, Сычкоўская ня выканалі дырэктывы райкому аб мабілізацыі мас комсамольцаў, колгаснай моладзі і колгасьнікаў на датэрміновае скачаньне збожжазагатовак.

Упаўнаважаныя райкамолу т. т. Лясьнічэнка, Фрыдлянд і Шчэрва, будучы ў с-саветах бяздзейнічалі і датэрмінова пакінулі іх. РК вынес гэтым т. т. суровыя вымовы і прапанаваў усім упаўнаважаным райкому забясьпечыць у найкарацейшы тэрмін выкананьне пляну збожжанарыхтовак.

Комсамольскія ячэйкі прадпрыемстваў не дапамагаюць падшэфным сельсаветам у збожжазагатоўках. Бюро райкому, абгаварыўшы стан работы комсамольскіх ячэек Кустпрома і мармэляднай ф-кі, абвясьціла бюро гэтых ячэек вымову і прапанавала ячэйкам прадпрыемстваў Бабруйску неадкладна ажывіць работу па загатоўках у падшэфных сельсаветах.

Дэкаднік штурму працягваецца. Усе ўпаўнаважаныя затрыманы ў сельсаветах.

К.

Аздаравіць кіраўніцтва Кушнікоўскага с-савету

Стан загатовак па Кушнікоўскім с-савеце прымушае біць трывогу.

Плян збожжа выканан на 32 пр., бульбы на 50 проц. Асабліва адстае аднаасобны сэктар які зрывае здачу па кантрактацыі. С-савет не стварыў рашучага пералому ў нарыхтоўках, спатыкаючыся на сабатаж. Партыйная і комсамольская ячэйкі—у баку ад загатовак.

Раённыя організацыі абавязаны праверыць здольнасьць кіраўніцтва Кушнікаўскага с-савету выконваць дырэктывы партыі і ўраду. **Б.**

Зламаць сабатаж кулака

Процант хлебанарыхтовак па Полацкім раёне ўяўляецца нездавальняючым. На 1-е лістапада выканана 39 пр. замест 65. У параўнаньні з мінулай пяцідзёнкай зрух зусім нязначны—крывая ўзьнялася толькі на 3,6 проц.

Шпаркаўшчынскі, Бабылеўскі, Арміеўскі, Астраўшчынскі, Бельскі с-саветы плян выканалі ўсяго ад 16 да 25 проц.

На кулацка-заможныя гаспадаркі, якія сабатуюць цьвёрдыя заданьні, няма ціску. Астрашынскі с-савет ня ўзяў па цьвёрдым заданьням ніводнага цэнтнера збожжа. Усяго па раёне спагнана 31 проц. цьвёрдага заданьня.

Партыйна-комсамольскія ячэйкі раду с-саветаў бяздзейнічаюць у нарыхтоўках. Толькі адзін, Экімянскі с-савет, па-ўдарнаму разгарнуў масава-палітычную работу, набліжаецца да завяршэньня пляну: выканаў 85 проц.

Дабіць опортуністычную стаўку на самацёк, даць рашучы бой кулацка-рвацкім тэндэнцыям у колгасах. Райн павінен выйсьці ў перадавыя. **М. Віленскі.**

Распачаць перапрацоўку

Крупкі. Ўзвадзі сельсавет не пачынаў першапачатковай апрацоўкі лёну ў колгасах і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках. Ніводнай кулацка-заможнай гаспадарцы ня дадзена цьвёрдых заданьняў. Комсамольская ячэйка ня выконвае пастановы ЦК ЛКСМБ аб месячніку ільназагатовак. Райком комсамолу абавязан забясьпечыць баявое правядзеньне месячніка. **М.**

Апарос--тона

С. Голуб.

Песьціцца на сонцы, і танучы ў зелені, адзінокія хаткі колгасьнікаў. Блішчаць люстэркамі шыбы. Хаўравіта тапырацца над іржавымі шапкамі саламяных стрэх пагнутыя трухлявыя хляўкі.

А між іх пачынае расьці распачаты будовай вялізарны, новы сьвінарнік. Як мурашкі, варушацца каля яго людзі. Упартая брыгада Кузьмы Шуціка спаборнічае з ударнай брыгадай комсамольца Рыгора. Цокаюць гулка сякеры. Пырскаюць трэскі. Шумна шушукаюць пілы і плююцца пілавіньнем. Коціцца градам буйны, гарачы пот. Але ніхто не пасяліўся і хвіліны. Порвы за порцыямі абчэсанага пад шнур бярвеньня шпарка кладуцца на гладкія сьціны сьцен. З кожным днём усё вышэй вышэй уздымаецца сьвінарнік.

Так шасталі дні за днямі, дэкады за дэкадамі бурлівай працы.

Як тарпа між коп, раптам вырас між старых, пакрыўленых, новы вялізарны прасторны хлеў. Шырока расчыненыя раты варот прагна чакалі ў абдымкі свайго каморчатага нутра шустых курносых матак.

М-ну-ў,—прагаварыў Кузьма хітрым голасам, калі ў хляве быў наведзен парадак.—Ня хлеў, а цацка. Цяпер ваш абавязак напоўніць яго сьвіньнямі.

— Напоўнім, дзядзька Кузьма, напоўнім,—гучэў сакавіты голас Зосі Прыгасаўшы шаўкавіста-ільняны жмут кос, што зьвісаў на самыя плечы, Зося пільна пачала аглядаць новы будынак.

Праз некалькі дзён з сьвінасаўгасу прывезьлі дванцаць пяць ангельскіх матак. Такая колькасьць не здаволіла Зосю. Было яшчэ з паўсотні галоў. А хлеў мог праглынуць дзьвесьці матак. Сто дванцаць пяць месц гулялі. Сто дванцаць пяць месц трэба запоўніць. Купіць няма дзе і незашта. Ды з парожнім хлеў не пакідаць-жа.

Дабраахвотнае абагуленьне ў каго дзьве-тры сьвіньні — іскрапетная думка мільганула у Зосі, калі яна праглядала сьпіс дробнай жывёлы колгасьнікаў. Гэтая ідэя паказалася ёй надзвычай вялікай і карыснай справай для ўсяго колектыву. З гэтага-ж дня і на пасяджэньні партбюро і праўленьня колгасу і ў прыватнай гутарцы яна стала агітаваць за дабраахвотнае абагуленьне дробнай жывёлы.

— Дык так, — падсумоўвала Зося сваю думку на бурным сходзе колгасьнікаў,—у першую чаргу колгасу а потым сабе.—Гэта закон для ўсіх колгасьнікаў. І толькі пры такой адданасьці агульнай справе нам ня страшна нічога. Цяжка было будаваць, але збудавалі. Купіць вялікі гурт сьвіней няма дзе і незашта. Але шляхам дабраахвотнага абагуленьня ў тых, хто мае дзьве-тры сьвіньні, мы пераможам і гэтую цяжкасьць.

— Мы не дамо!—крычалі адны, паскакваўшы з месц.

— А мы дамо!—крычалі другія.

Першым пачаў Яўмен—куцы, клыпаногі, калматы. Вочы іскрыліся злосьцю.

— Я ня дам. Хоць, зарэжце ня дам Нідзе гэтак не рабілі і ня робяць! Хопіць з мяне таго, што маіх дзьве каровы і два кані абагулены. А сьвіньні ня дам! Сам бяз мяса жыву!

— А я абагулю сьвіньню і авечку —упэўнена гаварыў Рыгор, комсамолец.—А хто ня хоча, ня трэба. Тут прымусу няма. І нечага такім дарэмна крычаць, гарлапаніць перад сходам.

Зноў зашумелі у спрэчках.

Шмат хто хістаўся і сюды і туды. Урэшце восемдзесят колгасьнікаў згадзіліся па сьвіньні абагуліць. І на другі дзень падводы за падводаю ехалі да сьвінарніка. Зьвязаныя сьвіньні прарэзьліва пішчалі. Калі пушчалі ў паасобныя каморкі, яны баязьліва тапырыліся і трывожна хрукалі, аглядаючы і абнюхваючы незнаёмае месца.

Ну, што! — спытала Кузьму Зося калі ён зьнёс з падводы ладнага падсьвінка.—Скора збудавалі сьвінарнік але яшчэ скарэй напоўнілі яго.

— Войстравокая ты у нас, востравокая!

Усё заўважаеш. Далёка наперад прадбачыш.

— Дарэмнымі сьвіньнямі і дурань запоўніць. А вось хай нагадуе, ды хваліцца.—заўважыў Хрыстахор.

— Пакуль новых нагадуюць, дык гэтых хутчэй за хлеў павыцягваюць —дадаў са злосьцю Яўмен.

Поўная шчасьця ад паспяховага абагуленьня, Зося ня ведала, як і каму у першую чаргу адказваць. Яе вочы палалі радасьцю. На недарэчнае нездавальненьне Яўмена з Хрыстахорам яна усьміхнулася. Ні сур'ёзнасьці, ні задуменасьці на твары.

Дзіцяча любы, прыемны выгляд яе быццам казаў: Мы сваёй мэты дасягнем. Нам нічога ня страшна.

II

Кожны дзень Зялёна-сакавіты абрус канюшынішча, як неба белагрывымі пузыркамі хмар пакрываўся штодня рухавым стадкам сьвіньней. І люба было падзівіцца як кірпатыя беласьнежныя анёлкі і доўгадзюбыя тубыльцы войстрымі сечка-травамі зьбіраюць і сякуць канюшыну.

Але гэта ня усё, гэта ня ўсё—марыла п'яная ад радасьці Зося Гэта толькі пачатак, першы крок. Шасьцімесячны апарос—тона. Во, во тона —вось чаго мы павінны дабіцца.— шаптала яна.—І мы даб'ёмся безумоўна даб'ёмся калі як належыць возьмемся за справу.

Радасны позірк глыбокіх вачэй раптам прыкіпеў да плякату, што вісеў на сьцяне перад уваходам у хлеў Крывыя растапыраныя літары трывожна крычалі аб прарыве на фронце сьвіндагляду. Хваля трывогі заліла твар.

— Ну, што новага?—зьмяніўшымся голасам запытала ў Хвадоры—жывёла вода, якая была лепшай ударніцай у колгасе.

— А вось, паглядзеце! — паказала Хвядора на адзінаццаць гладкіх, доўганькіх, як гурочкі парасятак.—Расьцем патроху. Не забудзьце напомніць Трахіму, каб своечасова зрабіў карытцы.

І не пасьпела Зося расчыніць рот, каб спытаць аб прарыве, як з другога канца хлява даляцела гаворка:

— Паварачвайся-ж хутчэй! Паварачвайся, мядзьведзь касалапы—крычала Варка.

— А каб табе зарвала! — грымеў голас Яўмена.—Брыкса праклятая!

— Што гэта у іх?

Прарыў,—адказала Хвядора.

— Зьнімеце яго адсюль!

— Зьнімеце! Я не асілак!

—Я ня конь, не машына. Яму гуль таю тут ня месца! — крычала Варка, калі падышла да іх Зося.

— На маёй сьпіне хоча выехаць!— тарапілася яна выказаць сваю крыўду

—А ты што? Можа ты за мяне і ваду і траву возіш, хлеў прыбіраеш? Хіба ты гэта робіш?—крычаў Яўмен.

— А хто учора сыроварту разьліяў, гной ня вывез, травы ня прывёз? Праз каго гэта на сьцяну плякат павесілі. Праз каго? Праз цябе агідны Глядзець не магу на вочы і твар твой калматы!

— Зь'ўтра будзе другі працаўнік, — сказала Зося.—А сёньня Варачка, папрацуеш адна да вечару.

Дагарэў дзень. Як праз сіта сыплецца імжакі змроку.

Вечар атуліў зямлю санлівасьцю.

Але ў клюбе бруяніла жыцьцё.

— Таварышы!—прагучэў голас Зосі, і шумны сход стаў на якар цішыні. Радасным позіркам акінула яна колгасьнікаў.

— Таварышы! Мы выканалі мясанарыхтоўку на 150 проц. Мы перамаглі цяжкасьці. Але гэта яшчэ ня ўсё. Мы павінны яшчэ дабіцца, каб з кожнага шасьцімесячнага апаросу маглі атрымаць тону мяса. Так так, таварышы, з аднаго апаросу тону мяса! Для гэтага ў нас ёсьць усе магчымасьці. Трэба толькі шырэй разгарнуць ударніцтва. Трэба стварыць лепшыя ўмовы для ўдарнікаў А сёньня піонэрам ударніцкай справы па пастанове праўленьня вызначана наступная прэмія:

— Рыгору—боты.

— Варцы—галёшы.

— Хвядоры—чаравікі.

— А дзе ж я? Дзе-ж я?—закрычаў з парогу Яўмен.

— Пра мяне забыліся?

— Я пасынак!—абурана і пакрыўджана гучэў яго голас. Ён спыніўся, быццам чакаў спачуваньня колгасьнікаў. Потым акінуў усіх вар'яцкім позіркам і працягваў:

— Я абагуліў два кані, дзьве каровы, двое жалезных калёс, абагуліў гумно і мне ніякай прэміі. А Варцы, каторая ўступіла у колгас, як абадраная ліпка, далі прэмію. А я таксама працаваў на сьвінарніку. Дык дзе-ж тут роўнасьць?

— Трэба быць ударнікам!—адказаў нехта з натоўпу.

— Абагуленых кароў і коняй мала. Трэ' было вось і гэта абагуліць?—страсануў Яўмен полы свае сьвіткі. Не пачуўшы падтрымальня, чырвоны, як рак, з набухлымі на лобе жыламі, зьнік у хвалях натоўпу.

Доўга цягнуўся бурны і радасны для пераважнай большасьці сход.

— Блізарукі Яўмен, блізарукі—шаптала Зося, ідучы да дому. Ніяк не зразумее стары новых умоў, чаго вартае колгаснае жыцьцё. А зразумець хутка неабходна. З шасьцімесячнага апаросу чыстакроўных англічанак дабіліся— тоны. Даб'ёмся гэтага яшчэ і з мяшанак.

...авучальны сустрэлі глыбокім прарывам

...іраўніцтва Сураскага РК ЛКСМБ сарвала падрыхтоўку да зімовай політвучобы ў сваёй організацыі

15 лістапада, згодна пастанове бюро ЦК ЛКСМБ, па ўсёй вясковай комсамольскай организацыі павінен быў распачацца ...овы політнавучальны год. К гэтаму часу ...ячэйкі павінны былі праз політ-агробаі ...чыць праверку ўсваеньня комсамольцамі ...ітмінімуму; стварэньне новай політсеткі, ...мплектаваньне яе слухачамі; падрыхтоўку кадраў і г. д. Карманская комсамолія ...ударнаму ўзялася за выкананьне гэтай ...ектывы. Организацыя праз політбаі скон... праверку ведаў кожнага комсамольца, ...з спэцыяльна створаныя курсы падрых...тавала 25 кіраўнікоў для політсеткі.

Аднак комсамольская организацыя Сураскага раёну, у процівагу Кармянскай, з-за опортуністычнай недаацэнкі бюро райкому ганебна сарвала ня толькі прапрацоўку політмінімуму, але і падрыхтоўку да зімняй політвучобы.

Такое становішча немагчымае.

АПТУ ЦК ЛКСМБ павінен неадкладна заняцца станам політвучобы ў Сураскай организацыі і прыцягнуць да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў марксыцка-ленінскага выхаваньня шырокіх комсамольскіх мас, дапамагчы организацыі наверстаць упушчанае.

Вывесьці політвучобу з палону самацёку

...сыгналы „Чырвонай Зьмены" ...ганебным прарыве на фронце ...вучобы ў раёне, Сураск райком ...амолу ня прыняў ніякіх захадаў. ...КСМ сваёй бязьдзейнасьцю ...а зрывае пастановы зьездаў і ...умаў комсамолу.

...раёне не праведзен поўны вучот ...ычна-няпісьменных і малапісьменых комсамольцаў; не організавана ...літсетка, яшчэ не вядома колькі ...ць гурткоў для політычна няпісьменых і малапісьменных комсамоль...

...ўсёй сыстэме політвучобы поўная абязьлічка. У ячэйках няма адных за правядзеньне політзаняткаў. ...чаму ў ячэйках Шаброўскага ...савету політвучоба за ўвесь летні ...яд не праводзілася. Сэкратары ...х ячэек пад шыльдай об'ектыўных прычын сарвалі політвучобу.

...ячэйцы колгасу „Чырвоны маяк" ...весь час толькі раз праведзены ...тзаняткі. Партпрымацаваны т. ...ксееў не дапамог ячэйцы ў гэтай ...ы.

...ячэйцы колгасу „Курына" ўжо ...ш 2 месяцаў няма заняткаў.

...ячэйках Полаўскага сельсавету ...ная вучоба поўнасьцю правалена. ...танова IX зьезду аб ліквідацыі ў ...есячны тэрмін політняпісьменнасьці ...выканана. Комсамольцы ня ведаюць, што такое „політмінімум". Ні ...у з ячэек не паступала яшчэ да ...заняткаў зімовай політвучобы. ...кое самае становішча ўвесь час ...у шклозаводзе „Ноўка". 200 ком... ...політвучобай. Толькі зараз, дзякуючы

сыгналам „Чырвонай Зьмены" і дапамогі яе брыгады політвучоба пачала наладжвацца. Організаваны 4 пазьменныя гурткі і 2 політшколы (вячэрнія і ранішнія), якія рэгулярна працуюць 3 разы ў тыдзень.

У ячэйцы Вярэчкаўскага сельсавету політмінімум праводзіцца „наогул".

У большасьці ячэек раёну політвучоба ня ўвязваецца з практычным удзелам комсамольскай організацыі ў гаспадарчым будаўніцтве, у разьвіцьці жывёлагадоўлі, зябліве і г. д.

Зусім слаба пастаўлена работа з навічкамі. Няма дыфэрэнцыяванага падыходу. Уся работа вядзецца самацёкам.

Беспартыйная працоўная моладзь комсамольскай політвучобай не ахоплена.

РК КСМ і райпартгабінэт не даюць мэтадычнага кіраўніцтва.

Райком комсамолу поўнасьцю не забясьпечыў ячэйку літаратурай па політмінімуме. Кожная ячэйка атрымала толькі па адной брошуры. Лябараторны мэтод заняткаў пры гэтым нямысьлім.

Гарадзкая організацыя комсамолу не мобілізавана на дапамогу вясковай.

РК ЛКСМБ павінен зараз-жа пераключыцца на баявыя тэмпы, каб зьнішчыць прарыў на фронце ліквідацыі політняпісьменнасьці і дабіцца поўнай увязкі іх творы з практыкай ў галіне гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і барацьбы за выкананьне пляну ...

Брыгада „Ч. З." Каночкін і Крэсік.

Выканаць баявую задачу

Кармянская комсамольская організацыя пачала больш-менш падрыхтаванай політвучобу. Па раёне абвешчан 10-ці дзеньнік праверкі ўсваеньня політмінімуму усёй організацыяй. Паміж усіх ячэек праведзены палітбаі з 1 па 10 кастрычніка.

20 кастрычніка па раёне праведзен адзіны дзень політвучобы, які даў вялізарны зрух у стварэньні новай сеткі політшкол комплектаваньня іх слухачамі і забясьпечаньні школ памяшканьнем.

10-ці дзённыя курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў для політсеткі скончылі 25 чалавек.

Перад кожным комсамольцам настаўлена задача: самому вучыцца і уцягнуць у політсетку ня менш 3 чал. беспартыйнай моладзі.

Лічба завочнікаў комсамольскага актыву будзе даведзена да 100 чал.

У радзе ячэек пачалося заключэньне соцдагавораў паміж політшколамі і паасобнымі комсамольцамі на лепшае правядзеньне зімовай політвучобы. Некаторыя політшколы ... на адзей насьценнай газэце.

Пры кожнай школе організоўваюцца пасты „Чырвонай Зьмены", якія будуць асьвятляць работу школы.

Для дапамогі у зімовай політвучобе у адстаючыя ячэйкі накіраваны 10 чал.

Астапенка.

Ігнаруюць політвучобу

Комсамольскія ячэйкі Сакалішчанскага сельсавету Расонскага раёну сарвалі прапрацоўку політмінімуму: заняткаў ня было ні разу. Зрыў вучобы тлумачыцца выключна тым, што ячэйкі (Чырвонае Сакалішча і інш.) ігнаруюць гэту важнейшую галіну комсамольскай работы.

Шпакоўскі.

З вывазкай не марудзіць ні дня!

Забясьпечыць гнуткім і опэрацыйным кіраўніцтвам вывазку торпу, падрыхтоўчыя работы да сэзону, ліквідаваць абязьлічку — асноўныя ўмовы для поўнага выкананьня пляну торпздабычы 1932 г.

Кіраўніцтва Белторпу і спажыўцы яго продукцыі ня здолелі выканаць да канца пляну здабычы тарпянога паліва. Высушаны і складзены у штабэлі торп застаецца ляжаць на балоце. Гатовы продукт у строга-вызначаным плянавым парадку не накіраван на тарпяныя склады, к топкам электростанцый, фабрык і заводаў.

Перабоі і бясплянавасьць у гэтай працы занялі пачэснае месца. Белторпаб'яднаньні, як вытворца тарпянага паліва, і яго спажыўцы не зразумелі таго, што малейшае адхіленьне ад пляну стварае яўную пагрозу асталоўкі раду фабрык і заводаў, якія спажываюць тарпяны апал

Вось чаму вывазка 447 тысяч тон торпу да яго спажыўца —адна з асноўных задач тарпянай прамысловасьці у сучасны момант. Партыйна-комсамольскія і профэсыянальныя організацыі торпарасрацовак, электростанцый, фабрык і заводаў максімум увагі і бальшавіцкай дзелавітасьці павінны праявіць у гэтай адказнай працы, паставіць справу так, каб скончыць вывазку ў вызначаны тэрмін—да 1-ІІІ—32 г., а фрэзэрны торп —да 1-І—32 г.

Гэта задача значна ускладняецца тым, што вывазка торпу мэханізавана ўсяго толькі на 50 проц. Вось чаму большая частка заводаў яшчэ ня вывозяць торп з балота: з 23 заводаў вывозяць торп толькі 6.

Аднак і тыя заводы, што маюць мэханізаваны транспарт, не спраўляюцца з работай з прычыны дрэннай організацыі працы транспортнага аддзелу.

Такі буйны завод, як Асінторп. выконвае квартальны плян па вывазцы торпу Белдрэсу толькі на 80 проц. Аварыйны запас торпу на тарпяным складзе можа забясьпечыць Белдрэс, у выпадку аварыі транспорту, толькі на 10 дзён. Ганебнае адставаньне з вывазкай торпу да спажыўца нельга тлумачыць толькі об'ектыўнымі прычынамі: недахопам рэек, вагонэтак, жалеза, лесаматар'ялаў і г. д. Прычына у тым, што Асінторп нерацыянальна скарыстоўвае рухомы склад транспортнага аддзелу і мэханізмы для пагрузачных работ, што парабовы і брыгада па пагрузцы і разгрузцы торпу не перакінуты на гаспадарчы разрахунак, не ліквідавана абязьлічка і ўраўнілаўка ў зарплаце. Назіраюцца выпадкі зрыву спаранай язды. Магчымасьці поўнай мэханізацыі пагрузачна-разгрузачных работ не выкарыстоўваюцца адміністрацыяй Асінторпу, 2 тор заб'ядняваны не працуюць, замяшчаюць значную колькасьць рабочых. Чывярзнасьць і блытаніна што ісьнуюць у гэты час між Белторпаб'яднаньнем ВСНГБ у пытаньнях вывазкі торпу ... Прамзўн і Белторп нават і зараз не ведаюць, як ідзе вывазка і наколькі процантаў выканан плян, бо ня кіруюць як сьлед гэтай працай.

Некаторыя заводы, перадаўшы функцыі вывазкі спажыўцам, спакойна пачываюць на лаўрах (торпзавод Ленінскі шлях).

Каб вывезьці гужам 223 тысячы тон торпу, патрэбна работа 4767 фурманак на працягу 55 дзён. Ня гледзячы на гэта торпзаводы і спажыўцы торпу не разгарнулі заключэньня умоў з сельсаветамі і калгасамі на вывазку торпу гужавою цягай у вызначаных раёнах.

Значную блытаніну ў заключэньні дагавароў ствараюць на мясцох РВК, гарадзкія, местачковыя і сельскія саветы. Заключаныя заводам „Давідаўка" у 4 сельсаветах ўмовы на вывазку торпу ануляваны Гомельскім гарсаветам. Бабруйскі РВК ня гледзячы на неаднакратныя пастановы РКК РСІ, да гэтага часу ня вызначыў сельсаветаў торпзаводу „Новая Беларусь". Некаторыя торпзаводы, напрыклад „Зьвязда", не прыступалі да заключэньня умоў толькі з прычыны адсутнасьці фуражу і прэміяльнага фонду.

На чарапашых тэмпах і об'ектыўшчыне ня б'юць ні Белторп, ні ВСНГБ ні мясцовыя партыйныя, комсамольскія савецкія і профэсыянальныя організацыі. Безадказнасьці у складаньні дагавароў на цягавую і рабочую сілу трэба пакласьці канец, паставіўшы справу на ўдарныя рэйкі.

Падрыхтоўчая работа

як асноўная задача ў выкананьні пляну торпаздабычы сэзону 1932 году, не разгорнута ва ўсю шыр. І гэтым вучасткам працы Белторп кіруе слаба. Кантрольныя лічбы на 1932 год не даведзены да кожнага тарпяніка і тарпяніцы. Торпазаводы ня высунулі сваіх сустрэчных плянаў на аснове здабытых дасягненьняў у выніку пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак і прогрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі ў зарплаце.

Вось чаму падрыхтоўчыя работы застаюцца адсталым вучасткам у працы торпзаводаў.

На 15 кастрычніка торпзавод „Грэбенева" падрыхтаваў кар'ерныя канавы на 65,3 проц., картавыя канавы на 83 проц., выкарчаваў балота на 72 проц. і сплянтаваў на 31,4 проц.

Такое адставаньне

торпзаводы тлумачаць невыстарчальнасьцю рабочай сілы, спецвопраткі (бахіл, ботаў, рукавіц і г. д.) Аднак сакрэт адставаньня зусім просты. Торпзаводы ў большай сваёй частцы няправільна выкарыстоўваюць рабочую сілу і мэханізмы для падрыхтоўчых работ, не палепшылі культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых (ацяпленыя баракі), ... ня стварылі ўмоў для цякучасьці рабочай сілы. К таму-ж заводы не паладзілі арганізаванага набору рабочае сілы, паклаўшыся на самацёк.

У дні, што засталіся да падрыхтоўчых балот, неабходна нагнаць упушчанае, рацыянальна скарыстоўваючы мэханізмы і рабочую сілу. Пляны торпаздабычы на 1932 год поўнасьцю забясьпечыць неабходнай для эксплёатацыі плошчай.

М. Плашчынскі.

У барацьбе за выкананьне соцумовы з Ленінградзкай „Сменай"

...Да пачатку работ забясьпечыць у складзе інжынэрна-тэхнічных работнікаў ня менш 15 проц. комсамольцаў (з умовы па спаборніцтву „Ч. З." з „Сменай")

...ыхтаваць камандзіраў барацьбы з бездарожжам

...апярэдзіць зрыў у падрыхтоўцы кадраў для дарбуду

...ост народнай гаспадаркі востра ...авіў задачу падрыхтоўкі кадраў ...дарожнага будаўніцтва. У кад...дарожнага будаўніцтва асабліва ...з адчуваецца вялікі недахоп.

...нак, такая організацыя, як Га...ўдартранс, невыстарчальна кі...падрыхтоўкаю дарожных кад...

...Менскім Аўтадарожным тэхні...ку, якім непасрэдна павінен быць ...каўлены Галоўдартранс, заняткі ...пачаліся 15-га кастрычніка. Сэк...кадраў Галоўдартрансу ўвесь ...спадзяваўся на дырэкцыю тэх...му, што студэнты будуць забя...печаны памяшканьнямі для за...яткаў і інтэрнатамі—у выніку ...тки адтэрмінавалі на цэлы ме...ся...

...алі-ж за гэтую справу ўзялася ЦК РСІ, пакоі для заняткаў былі ...атыманы, але займацца трэба ў ...ругую зьмену.

...У дадатак і зараз заняткі праходзяць нерэгулярна: па дзьве лекцыі ў ...зень, а бывае, і зусім зрываюцца.

...годна пляну, 3-ці курс тэхні...му трэба выпусьціць 1-га краса...віка будучага году, але пры такім ...тэмпе работы навучальныя пляны ...не будуць поўнасьцю і якасна вы...

канавы, студэнты не атрымаюць належнай падрыхтоўкі.

Ня лепш і з бытавымі ўмовамі. Студэнтаў новага набору разьмясьцілі ў новых бараках, за якімі няма добрага нагляду. Спэцыфіка работы студэнтаў Аўтадарожнага тэхнікуму (чарчэньне плянаў, складаньне проэктаў і інш.) патрабуе выстарчальнага сьвятла для продукцыйнай работы, асьвятленьне-ж якраз слабое. Падлогі мыюцца толькі за гадавых рэволюцыйных сьвят, бруд у памяшканьнях—звычайная зьява.

У організацыі вытворчай практыкі пануе самацёк. Практыкай студэнтаў ня кіруюць вучасткі і дыстанцыі, якія непасрэдна падпарадкаваны Галоўдартрансу і павінны кіравацца яго ўказаньнямі ў гэтай галіне.

Ня гледзячы на пляны, якія прадугледжваюць поўную колькасьць тэорэтычных гадзін і практыкі па ўсіх процэсах дарожных работ, студэнты практыканты ў час практыкі скарыстоўваліся толькі ў якасьці чорнарабочых. У процэсе працы начальнікі дыстанцый груба адносіліся да практыкантаў, як, напр., нач. дыстанцыі Марозаў. Ён-жа ўстанаўліваў па свайму меркаваньню стаўкі за працу, ня ўлічваючы пры гэтым працаздольнасьці і кваліфікацыі.

У далейшым адміністрацыя тэхнікуму і Галоўдартранс павінны зьвярнуць большую ўвагу на падрыхтоўку кадраў дарбуду, безадкладна абмяркаваць стан падрыхтоўкі кадраў у тэхнікуме, забясьпечыць добрыя ўмовы работы, а для студэнтаў усіх курсаў, і асабліва 3-га забясьпечыць якасную прапрацоўку навучальных плянаў.

Акунёў С., Лоўчанка К.

„1-ае Мая" не прыступіў да вывазкі торпу

Па кантрольным лічбам Белторпаб'яднаньня торпарасрацоўкі „1-е мая" (Віцебск) павінны ў сэзоне 1932 г. здабыць торпу машынафармовачным спосабам 34000 тон і фрэзэрным 30000 тон.

Паважлічаная програма торпаздабычы на 1932 г., у большай частцы за лік фрэзэрнага турпу, патрабуе ад адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу і партыйна-комсамольскай і профэсіянальнай організацый заводу максімум энэргіі накіраваць на 100 проц. выкананьне плянаў падрыхтоўчых работ па асушцы, карчоўцы і плянтоўцы балота.

Ад таго, наколькі торпа-распрацоўкі справяцца з гэтай задачай, залежаць посьпехі выкананьня торпфінпляну 1932 г.

Аднак, ня гледзячы на рашаючую важнасьць падрыхтоўчых работ, завод „1-е мая" з гэтай адказнай задачай ня справіўся.

На сёньнешні дзень падрыхтоўчыя работы па фрэзэрнаму спосабу праведзены на плошчы 40 га і па машынафармовачнаму на плошчы 29 га, што ў сярэднім складае каля 77 проц. выкананьня пляну падрыхтоўчых работ.

Падрыхтоўка балот працягваецца. Кіраўніцтва заводу мяркуе некаторыя процэсы падрыхтоўкі праводзіць у зімовы час.

Значна горш справа з вывазкай торпу да спажыўца. Незакончанае будаўніцтва вузкакалейнага шляху з-за недахопу рэльс і жалеза не дае магчымасьці прыступіць да вывазкі торпу з балота.

Такім чынам ствараецца яўная пагроза парушыць плянавае забясьпечаньне палівам папяровай ф-кі „Чырвоная зорка".

Да адказнасьці зрыўшчыкаў будаўніцтва

ЛЁЗНА. Будаўніцтва сьвінарнікаў у колгасе „Полымя" Добрамысленскага с-савету зрываецца. Вылучаныя адказнымі за будаўніцтва члены праўленьня колгасу Кабаноў Ф. і Марцыновіч ніякіх мер ня прымаюць, каб закончыць свінарнікі. Таксама не рамантуюцца і старыя сьвінарнікі. Каля 18 сьвінаматак знаходзяцца на двары пад адкрытым небам. Брыгада песьляроў: Васількоў, Дрэбесаў і Міхальчэнка сыстэматычна робяць прагулы, п'янствуюць у час працы і гэтым самым зрываюць будаўніцтва.

Ніякага контролю за будаўніцтвам. Будаўнічы матар'ял, цьвікі і дошкі расьцягваюцца для асабістых патрэб.

Нормес.

ПАКЛАСЬЦІ КАНЕЦ ПРОВОКАЦЫЙНЫМ АНТЫСАВЕЦКІМ ВЫДУМКАМ ЯПОНСКАЙ ВАЕНШЧЫНЫ

Антысавецкая кампанія з мэтай ускладніць адносіны між Японіяй і СССР

14-га лістапада камісар па замежных справах СССР—т. Літвінаў—запрасіў японскага пасла п. Хірота і зрабіў яму наступную заяву для перадачы японскаму ўраду:

„У заяве, якая перадана вам намесьнікам народнага камісара па замежных справах п. Караханам 20 кастрычніка г. г. саюзны ўрад ужо адзначыў поўную беспадстаўнасьць і злусьлівасьць вымыслаў і чутак, якія выходзяць з безадказных колаў, так ці інакш зацікаўленых у сучасным становішчы Манчжурыі ў распаўсюджваньні провокацыйных чутак.

Урад СССР з яскравасьцю заявіў што ён прытрымліваецца палітыкі строгага няўмяшаньня, якое выцякае з яго традыцыйнай нязьменнай палітыкі міру, павагі міжнародных дагавароў, заключаных з Кітаем і павагі чужаземных правоў і незалежнасьці іншых дзяржаў. Саюзны ўрад быў у праве чакаць, што яго настолькі ясная заява якая не пакідае месца для якіх-небудзь сумненьняў, або недамовак, і па паведамленьню, якое зроблена Вамі намесьніку Наркоміндзелу п. Карахану, была спаткана задавальненьнем японскага ўраду, палажыць канец провокацыйнай антысавецкай кампаніі і вымышленьням аб дапамозе, якую нібыта ўрад СССР аказвае як'м-бы там ні было кітайскім войскам у Манчжурыі. Савецкі ўрад з пачуцьцём крайняга жалю прымушан констатаваць, што зацікаўленыя японскія вайсковыя колы працягваюць займацца вымысламі і распаўсюджваньнем праз японскі друк і тэлеграфнае агенства пазбаўленых усялякіх падстаў чутак аб тым, што СССР дапамагае тым ці іншым кітайскім генэралам.

Аб характары і крыніцах гэтых чутак сьведчыць між іншым афіцыйная заява, якая была зроблена 12 лістапада прадстаўніком японскага ўраду ў Мукдэне.

Саюзны ўрад ня можа пакінуць без увагі і той факт, што такое-ж меркаваньне было выказана 12 лістапада японскім віцэконсулам у Харбіне п. Накано ў яго гутарцы з кіраўніком генэральнага консульства СССР у Харбіне.

Саюзны ўрад зьвяртае ўвагу японскага ўраду на гэтую нясумненна антысавецкую кампанію, якую сыстэматычна праводзяць вайсковыя колы Манчжурыі з мэтай ускладніць адносіны між Японіяй і СССР. Разам з тым урад СССР лічыць своечасовым напомніць аб запэўненьнях японскага пасла, якія былі зроблены мне ў тым, што інтарэсам СССР ня будзе нанесена шкоды здарэньнямі ў Манчжурыі. Аб гэтым я падаю тым больш напомніць, бо ёсьць інформацыя аб тым, што японскае камандаваньне рыхтуе перасячэньне К.-У. чыгункі ў раёне Цыцыкара з паралізаваньнем дзейнасьці дарогі, што нанясе СССР матар'яльныя страты. Саюзны ўрад разьлічвае, што запэўненьні, якія былі зроблены японскім урадам, захоўваюць сваю моц і ня будуць парушаны.

Пераконаны ў тым, што генэрал Ма не атрымлівае дапамогі ад СССР

ШАНХАЙ. 14. Корэспондэнт амэрыканскай газэты „Івнінг пост" паведамляе наступнае: амэрыканскі консул Хэмсон і інш. замежныя консулы ў Харбіне пераканаы ў тым, што генэрал Ма не атрымлівае дапамогі ад СССР і што толькі Цыцыкарскі арсэнал забясьпечвае яго ваеннай амуніцыяй. Як паведамляе адзін з замежных консулаў,—працягвае корэспондэнт,—японскі консул у Цыцыкары таксама адзначае, што генэрал Ма не атрымлівае дапамогі ад савецкага ўраду, хаця японскі консул у Манчжурыі заяўляе, што сібірскія вагоны-цыстэрны ад нафты тайна перавозяць вайсковае ўзброеньне.

Бомбы з японскіх самалётаў на кітайскай тэрыторыі

ШАНХАЙ 13. Па паведамленьню Гоміня, між хэйлунцзянскімі войскамі і аб'яднанымі сіламі Чай-Хай-пэна і японцаў сёньня ізноў аднавіліся сутычкі. Японскія самалёты прыкрываючы наступальныя опэрацыі войск Чай-Хай-пэна, бамбардавалі Ангаоцзі і скідалі бомбы над кітайскімі пазыцыямі ў Цзянцзяо.

Адзін самалёт зьбіты кітайскімі зэнітнымі гарматамі.

Чарговы наступ на зарплату рурскіх рабочых

БЭРЛІН 13. Рурскія прадпрыемцы прынялі пастанову аб скасаваньні з 30-га лістапада індывідуальных тарыфных дагавароў з мэтай дамагчыся паніжэньня зарплаты з 1-га сьнежня.

Ленінскую „Праўду"—у масы

Большасьць ячэек прадпрыемстаў і ўстаноў г. Менску пастанову ЦК і ГК КП(б)Б, да гэтага часу ня выканала.

Ведама, што посьпех у барацьбе за новых чытачоў ЦО парт[ыі] „Праўда" можа быць пры разгорнутай масавай рабоце партыйных, комсамольскіх, профэсыйных і іншых організацый, што займаюцца распаўсюджваньнем. Ведама, калі гэтыя організацыі павядуць не толькі кампанійскую, а і сыстэматычную масавую працу вакол пытаньняў і задач, якія ставіць перад ЦО партыі—„Праўда", тады з задачай мы зможам справіцца.

На вялікі жаль, некаторыя партыйныя, комсамольскія, профэсыйныя і іншыя організацыі недаацэньваюць, а пад час і опортуністычна настроены ў справе шырокага прасоўваньня „Праўды" у шырокія колы рабочых і колгасьнікаў. Яны ня бачаць новых рэзэрваў чытачоў ЦО партыі.

Паасобныя партколектывы і ячэйкі КП(б) на агульных сходах не абгаварвалі нават пытаньняў работы вакол „Праўды". Упаўнаважаныя ячэек па масавай рабоце ў партколектывах, ячэйках і цэх'ячэйках адсутнічаюць.

Замест узмацняць тэмпы прасоўваньня ЦО партыі „Праўда", большасьць ячэек Менскай організацыі наслабіла масавую работу, дзякуючы гэтаму заданьне па Менску ў 10 тыс. экз. падпіскі на лістапад выканана толькі на 79 проц.

Неабходна моцна ўдарыць па ўсялякай недаацэнцы масава-палітычнай работы вакол «Праўды». Кожны комуністы, кожная партыйная ячэйка, кожная профэсыйная організацыя, органы сувязі і Белкоопсаюз, якім даручана распаўсюджваньне друку, павінны ведаць, што распаўсюджваньне пэрыодычнага друку, а ў прыватнасьці ЦО партыі „Праўда" сярод шырокіх боляў рабочых і колгасьнікаў—справа не комэрцыйная, а палітычная. Распаўсюджваць ЦО партыі „Праўда"—гэта значыць яшчэ больш паглыбіць партыйны ўплыў у шырокіх масах працоўных, гэта значыць яшчэ больш згуртаваць іх на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне ўсіх нашых плянаў соц. будаўніцтва, за генэральную лінію партыі.

С-Б.

Шматмільённаму комсамолу—шматтысячную „Чырвонку"

КОМСАМОЛ ЦЕРАХАЎШЧЫНЫ ВЫСУНУЎ СУСТРЭЧНЫ

По перадавым раўняйцеся ў барацьбе за тыраж

Рад комсамольскіх організацый практычна прыступіў да масавага распаўсюджаньня маладзёжнага друку, і ў гэтым кірунку праводзіць сталую працу сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі (Церахоўшчына, Загорская ячэйка, ячэйка колгасу „Профінтэрн"). Аднак, недапушчальна опортуністычна адстаюць Гомельская і Барысаўская організацыі.

Комсамольцы, комсамольскія ячэйкі, колектывы і райкомы, множачы вопыт перадавых у распаўсюджваньні юнацка-комсамольскага друку, паказвайце ўзоры бальшавіцка-опэрацыйнай работы з газэтай, дабівайцеся выкананьня лёзунгу: „Ні аднаго комсамольца, беспартыйнага маладога рабочага і колгасьніка, які-б ня выпісваў і ня чытаў комсамольскай газэты".

Наш сустрэчны

Заслухаўшы інформацыю аб стане распаўсюджваньня юнацкага друку па Церахаўскім раёне, бюро РК Церахаўскага ЛКСМБ высоўвае з свайго боку сустрэчны плян: замест кантрольнага заданьня ў 100 экз. „Комсомольской правды" распаўсюдзіць 150, „Чырвонай зьмены" замест 250—800 экз. „Юнгер арбэйтэр" замест 25 экз.—35, „Піонэр. праўды" замест 700—800 экз. „Піонэр Беларусі" замест 1000 экз.—1500, „Юнгер ленінец" замест 30 экз.—50, „Дружные ребята" замест 260—300 экз.

Паставіўшы сваёй мэтай давесьці сустрэчны плян да кожнай ячэйкі і кожнага комсамольца паасобку,—разгарнуць шырокую масава-тыражную працу, пры кожнай комсамольскай ячэйцы вылучыць упаўнаважаных па распаўсюджваньню друку, для праверкі таго, як комсамольцы чытаюць газэты, прапанаваць кожнай ячэйцы організаваць штомесяц вечары пытаньняў і адказаў.

Сэкратар РК ЛКСМБ Ратнэр

Загорцы ўперадзе

Комсамольцы ячэйкі вёскі Загор'е Рышкоўскага с-савету (Шклоўскі раён), улічыўшы вялікую карысьць „Чырвонай зьмены" для павышэньня політузроўню комсамольскай і беспартыйнай моладзі, падпісаліся кожны на 6 м-цаў.

Гэты добры пачын забясьпечыць сталую працу комсамольскай ячэйкі сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі з газэтай „Чырвоная зьмена".

Юрт.

Гомель адстае ў распаўсюджваньні юнацкага друку

Кантрольныя лічбы распаўсюджваньня юнацкага друку па Гомелі выконваюцца дрэнна. Замест 3200 экз. „Комсомольской правды" у кастрычніку было выпісана 2705 што складае 84 проц. Яшчэ горш справа з выпіскай „Чырвонай зьмены": замест заданьня ў 3500 экз. выпісваецца ўсяго 1554, Юнгер арбэйтэр" замест 450 экз.—171, гэта значыць 41 проц.

Гарком комсамолу, акрамя разьмеркаваньня кантрольных лічбаў па ячэйках, нічога не зрабіў для масава-тыражнай працы. Лік падпісчыкаў і чытачоў юнацкага друку з кожным днём зьмяншаецца. Напрыклад, ячэйка фабрыкі „Праца" у ліпені выпісвала 103 экз. „Чырвонай зьмены", ў кастрычніку 21. Такое-ж становішча і па Гомсельмашы, на заводзе „Пролетары" і інш.

Гаркому комсамолу неабходна зараз-жа наладзіць на раёне шырокую тыражна-масавую працу з юнацкім друкам.

Я. Б.

Ніводнага комсамольца бяз „Чырвонай зьмены"

Комсамольская ячэйка пры Любінскай ШКМ не рэалізавала поўнасьцю дадзеную ёй лічбу па распаўсюджваньню газэты „Чырвоная зьмена". На лістапад распаўсюджана ўсяго 80 экз.—лічба, далёкая яшчэ ад выкананьня пляну.

Многія комсамольцы яшчэ дагэтуль ня выпісваюць „ЧЗ". Бюро ячэйкі ЛКСМБ павінна паставіць перад сабою задачу: ніводзін комсамолец, ніводзін беспартыйны вучань без сваёй газэты „ЧЗ".

Брыгада „ЧЗ" Ташлер Р. Рашчэня А, Кунраш Х.

Чаго чакае ячэйка?

Выпіска газэты „Чырвоная зьмена ў Стара-Барысаўскім сьвінагадоўчым тэхнікуме налажана дрэнна На лістапад выпісана ўсяго 5 экзэмпляраў, тады як у тэхнікуме больш 200 студэнтаў, пераважна комсамольцаў.

Комсамольская організацыя сьвінагадоўчага тэхнікуму опортуністычна недаацэньвае важнасьці работы па распаўсюджваньню друку сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

Комсамольскай організацыі неабходна карэнным чынам перабудаваць сваю працу ў галіне распаўсюджваньня маладзёжнага друку і паставіць пытаньне так, каб „Чырвоная зьмена" стала настольным дапаможнікам для кожнага комсамольца і беспартыйнага студэнта.

У. Бурдо.

„Маладзёжная" — змагар за выкананьне вытворчых плянаў

Маладзёжная старонка пры шматтыражцы заводу Варашылава (Менск) выходзіць 2 разы ў м-ц. Старонка групуе вакол сябе актыў юнкораў ударнікаў, мобілізуе комсамольцаў на выкананьне прамфінпляну, сыстэматычна асьвятляючы правядзеньне ў жыцьцё шасьці ўмоў т. Сталіна, абменьваючыся вопытам комсамольскай працы. Старонка адыгрывае вялікую ролю ў жыцьці заводзкае моладзі.

Акрамя шматтыражкі працу ўсіх зьненьняў комсамольскай організацыі асьвятляюць 16 штодзёнак. Мэтод брыгадных штодзёнак сябе цалкам апраўдаў. Аднак, яны не скарыстоўваюць усіх магчымасьцяй і часамі носяць выпадковы сьвяточны характар

Юнкор.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.